

# КАНВЕНЦЫЯ РАДЫ ЕЎРОПЫ АБ ПРАДУХІЛЕННІ ГВАЛТУ Ў АДНОСІНАХ ДА ЖАНЧЫН І ХАТНЯГА ГВАЛТУ І БАРАЦЬБЕ З ГЭТЫМІ З'ЯВАМІ

## Стамбульская канвенцыя

**АБАРОНА** АД СТРАХУ
**АБАРОНА АД ГВАЛТУ**

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE



## У ЧЫМ ПАЛЯГАЕ МЭТА КАНВЕНЦЫІ?

Канвенцыя Рады Еўропы аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з'явамі – гэта найбольш далёка ідучая міжнародная дамова, якая займаецца гэтым сур'ёзным парушэннем правоў чалавека. Яна імкнецца сфармаваць «нулявую цярпімасць» да такога гвалту і з'яўляецца важным крокам да таго, каб зрабіць Еўропу і іншыя рэгіёны свету больш бяспечнымі.

Падмуркам Канвенцыі з'яўляюцца прадухіленне гвалту, абарона ахвяр і судовы пераслед злачынцаў. Яна таксама імкнецца паўплываць на светапогляд людзей, заклікаючы ўсіх членаў грамадства, асабліва мужчын і хлопчыкаў, змяніць сваё стаўленне. Па сутнасці, гэта ўзноўлены заклік да большай роўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі, таму што гвалт у адносінах да жанчын вырастае з нераўнапраўных адносінаў паміж жанчынамі і мужчынамі ў грамадстве і падмацоўваецца культурай талеравання і ігнаравання гвалту.

## НАВАТАРСКІЯ РЫСЫ КАНВЕНЦЫІ

Канвенцыя разглядае гвалт у адносінах да жанчын як парушэнне правоў чалавека і форму дыскрымінацыі. Гэта значыць, што ў выпадках, калі дзяржавы не рэагуюць адпаведным чынам на такі гвалт, яны нясуць за яго адказнасць.

Гэта першая міжнародная дамова, якая дае вызначэнне гендарнай прыналежнасці. Гэта значыць, што ад гэтага моманту прызнаецца, што жанчыны і мужчыны не толькі з'яўляюцца біялагічна асобамі жаночага або мужчынскага полу, але што існуе таксама сацыяльна сканструяваная катэгорыя гендарнай прыналежнасці, якая вызначае асаблівыя ролі і паводзіны, уласцівыя жанчынам і мужчынам. Даследаванні паказалі, што пэўныя ролі і паводзіны могуць спрыяць таму, каб гвалт у адносінах да жанчын рабіўся прымальным.

Канвенцыя прадугледжвае ўгалоўную адказнасць за такія злачынствы, як калечанне жаночых палавых органаў, прымусовыя шлюбы, праследаванне (сталкінг), прымусовыя аборты і прымусовая стэрылізацыя. Гэта значыць, што дзяржавы ўпершыню будуць абавязаны ўвесці адказнасць за гэтыя сур'ёзныя злачынствы ў свае прававыя сістэмы.

Канвенцыя заклікае да ўдзелу ў барацьбе з гвалтам у адносінах да жанчын і хатнім гвалтам усе адпаведныя дзяржаўныя ўстановы і службы, каб гэтая дзейнасць была скаардынаванай. Гэта значыць, што ўстановы і няўрадавыя арганізацыі не павінны дзейнічаць паасобку, а мусяць выпрацоўваць пратаколы супрацоўніцтва.

# ШТО КАНВЕНЦЫЯ ПАТРАБУЕ АД ДЗЯРЖАЎ?

## ПРАДУХІЛЕННЕ

- змяніць адносіны, гендарныя ролі і стэрэатыпы, якія робяць гвалт у адносінах да жанчын прымальным;
- забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў для працы з ахвярамі;
- павысіць інфармаванасць грамадзян адносна розных форм гвалту і іх траўмуючых наступстваў;
- уключыць навучальныя матэрыялы па пытаннях роўнасці ў навучальныя праграмы на ўсіх узроўнях адукацыі;
- супрацоўнічаць з НУА, сродкамі масавай інфармацыі і прыватным сектарам для інфармавання грамадскасці.

## АБАРОНА

- забяспечыць, каб патрэбы і бяспека пацярпелых былі ў цэнтры ўсіх захадаў;
- стварыць спецыялізаваныя службы падтрымкі для аказання медычнай дапамогі, а таксама псіхалагічнай і юрыдычнай кансультацыі ахвярам і іх дзецям;
- стварыць дастатковую колькасць прытулкаў і бясплатныя кругласутачныя тэлефоны даверу.

## СУДОВЫ ПЕРАСЛЕД

- забяспечыць угалоўную адказнасць і адпаведнае пакаранне за гвалт у адносінах да жанчын;
- забяспечыць, каб ніякія акты гвалту не маглі быць апраўданы на падставе культуры, звычаяў, рэлігіі або так званага «гонару»;
- забяспечыць пацярпелым доступ да спецыяльных мер абароны падчас следства і судовага разбору;
- забяспечыць, каб праваахоўныя органы неадкладна рэагавалі на просьбы аб дапамозе і адпаведным чынам рэгулявалі небяспечныя сітуацыі.

## КОМПЛЕКСНАЯ ПАЛІТЫКА

- забяспечыць, каб усе вышэйпералічаныя меры былі часткай комплекснай і скаардынаванай палітыкі і здзяйсняць усебаковы адказ на гвалт у адносінах да жанчын і хатні гвалт.





## НА КАГО РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА КАНВЕНЦЫЯ?

Канвенцыя распаўсюджваецца на ўсіх жанчын і дзяўчатак любога паходжання, незалежна ад іх узросту, расы, рэлігіі, сацыяльнага становішча, міграцыйнага статусу або сексуальнай арыентацыі. Канвенцыя прызнае, што для некаторых груп жанчын і дзяўчатак рызыка стаць ахвярай гвалту вышэйшая, як для іншых, і дзяржавы павінны забяспечваць, каб іх асаблівыя патрэбы браліся пад увагу. Дзяржавам таксама рэкамендуецца прымяняць Канвенцыю ў дачыненні да іншых ахвяр хатняга гвалту, такіх як мужчыны, дзеці і пажылыя людзі..

## ЗА ЯКІЯ ДЗЕЯННІ КАНВЕНЦЫЯ ПРАДУГЛЕДЖВАЕ ЎГАЛОЎНУЮ АДКАЗНАСЦЬ?

Канвенцыя патрабуе, каб дзяржавы-удзельніцы ўвялі ўгалоўную або іншую юрыдычную адказнасць за наступныя дзеянні:

- хатні гвалт (фізічны, сексуальны, псіхалагічны або эканамічны);
- пераследаванне (сталкінг);
- сексуальны гвалт, у тым ліку згвалтаванне;
- сексуальныя дамаганні;
- прымусовы шлюб;
- калечанне жаночых палавых органаў;
- прымусовыя аборты і прымусовая стэрылізацыя.

Гэта дае ясны сігнал, што гвалт у адносінах да жанчын і хатні гвалт не з'яўляюцца прыватнай справай. Наадварот: каб падкрэсліць асабліва траўмуючы эфект злачынстваў у сям'і, злачынцу можа быць прызначанае больш сур'ёзнае пакаранне, калі ахвяра з'яўляецца жонкай або мужам, партнёрам або членам сям'і.



# ЯК АЖЫЦЦЯЎЛЯЕЦЦА КАНТРОЛЬ ЗА ВЫКАНАННЕМ КАНВЕНЦЫІ?

Канвенцыя ўсталёўвае механізм маніторынгу для ацэнкі таго, наколькі добра яе палажэнні рэалізуюцца на практыцы. Гэты механізм маніторынгу складаецца з двух асноўных элементаў: *Групы экспертаў па супрацьдзеянні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняму гвалту (GREVIO)* -- незалежнага экспертнага органа, і *Камітэта бакоў,* --палітычнага органа, які складаецца з афіцыйных прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц Канвенцыі. Іх высновы і рэкамендацыі дапамогуць забяспечыць выкананне дзяржавамі Канвенцыі і гарантаваць яе доўгатэрміновую эфектыўнасць.

www.coe.int/conventionviolence
conventionviolence@coe.int

Prems 131923

BEL

www.coe.int

Савет Еўропы з’яўляецца вядучай арганізацыяй кантынента па абароне праў чалавека. У склад гэтай арганізацыі ўваходзяць 46 дзяржаў-членаў, у тым усе члены Еўрапейскага саюза. Усе дзяржавы-члены Савета Еўропы падпісалі Еўрапейскую Канвенцыю па абароне Праў чалавека і асноўных свабод -дамову, распрацаваную для абароны праў чалавека, дэмакратыі і вяршынства закона. Еўрапейскі суд па правах чалавека назірае за рэалізацыяй Канвенцыі ў дзяржавах-членах.

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L’EUROPE